ных интересов. В первую очередь, это решение национальных, культурных и социально-экономических задач, развитие морально-этических ценностей и традиций белорусского общества, различных слоев населения. Журналисты, по мнению Д. И. Писарева, должны иногда дать справедливый урок обществу. Так утверждаются принципы демократической свободы, прав граждан и укрепляются основы гражданского общества, которое является гарантом устойчивого свободного и независимого развития государства.

## НОВЫ ЖУРНАЛІЗМ І ГОНЗА-ЖУРНАЛІСТЫКА: ЗМЕСТ І АКТУАЛІЗАЦЫЯ ПАНЯЦЦЯЎ

***Г. К. Тычко***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tychko@mail.ru*

Новы журналізм – від журналістыкі на мяжы мастацкай літаратуры і журналістыкі. У артыкуле аналізуецца генезіс накірунку, яго адгалінаванне (гонза-журналістыка). Разглядаюцца адметныя рысы гэтых з’яў, называюцца вядучыя прадстаўнікі. Адзначаецца нацыянальная беларуская спецыфіка ўключэння ў сусветны кантэкст.

***Ключавыя словы:*** новы журналізм; гонза-журналістыка; выдумка і канкрэтны факт; нацыянальныя традыцыі; беларуская дакументальная проза; раман галасоў.

## NEW JOURNALISM AND GONZO-JOURNALISM: CONTENT AND UPDATES OF CONCEPTS

***H. K. Tychko***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: H. K. Tychko (tychko@mail.ru)*

New journalism is a form of journalism on the border of fiction and journalism. The article analyzes the genesis of the direction, its branches (gonzo journalism). Distinctive features of these phenomena are considered, the leading

representatives are named. The national Belarusian specifics of inclusion in the world context are noted.

***Key words***: new journalism; gonza journalism; fiction and concrete fact; national traditions; Belarusian documentary prose; novel of voices.

У 1950–1960 гг. ХХ ст. ў ЗША ўзнік новы накірунак журналістыкі, які атрымаў назву «новы журналізм». Пад гэтым паняццем разумеецца від журналістыкі, які паводле свайго мастацкага-вобразнага ўвасаблення і спосабу падачы матэрыялу набліжаны да прозы. Знаходзячыся на мяжы мастацкай літаратуры і журналістыкі, новы журналізм у наш час набыў шырокую папулярнасць ва ўсіх краінах, у тым ліку і ў Беларусі, што ў пэўнай ступені тлумачыцца і глабалізацыяй сучаснага свету. Сённяшняя мастацкая літаратура непарыўна звязана з рэаліямі жыцця і кантэнтам сродкаў масавай інфармацыі (газет, часопісаў, медыя), якія асвятляюць і часцяком вызначаюць жыццё грамадства. Новы журналізм, займаючыся пошукам арыгінальных форм, новых сродкаў мастацкай інтэрпрэтацыі рэчаіснасці, выкарыстоўвае для гэтага канкрэтныя факты і біяграфіі рэальна існуючых людзей. Менавіта гэты факт падаграває цікавасць публікі да дакументальнай літаратуры і тлумачыць яе запатрабаванасць і папулярнасць.

«Новыя журналісты» сцвярджаюць, што стварылі новую форму празаічнага апавядання, якая злучыла ў сабе элементы фармальнай структуры празаічных жанраў з актуальнасцю і фактаграфічнай канкрэтнасцю газетнай хронікі, прадстаўляючы тым самым нейкі гібрыд журналістыкі і літаратуры. Між тым, цікавасць да рэальнага факта, імкненне адмежавацца ад «выдуманага», якое робіцца ледзьве не сінонімам «фальшывага», «штучнага», на мяжы ХХ–ХХІ стст. характэрна для ўсей сусветнай літаратуры і адпавядае густам сучаснай чытацкай аўдыторыі. Пра гэта сведчыць, у прыватнасці, і сусветны поспех так званых раманаў-галасоў – кніг С. Алексіевіч.

Новы журналізм як з’ява валодае шэрагам адметных рысаў. Перш за ўсё, гэта так званая белетрызацыя факта, альбо наданне сапраўднай падзеі выгляду мастацкай формы. Запазычваючы прыёмы белетрыстыкі, аўтары прадстаўляюць рэальную падзею, гістарычных асоб у форме мастацкага тэксту, сюжэт якога пабудаваны на рэальных фактах. Аднак гэта не вядзе да поўнай адсутнасці выдумкі ў падобных творах (напрыклад, дыялогі, перажыванні персанажаў, іх партрэтныя характарыстыкі застаюцца дадуманымі аўтарамі). (Гл., напрыклад, раманы А. Пашкевіча «Пляц Волі», Г. Севярынец «Гасцініца “Бельгія”».) У падобных творах

важна памятаць пра неабходнасць адрозніваць выдумку і выдуманы сюжэт ад рэальных падзей.

Рускі вучоны В. Халізеў, згадваючы крайнасць, якая існавала на пачатку XX ст., калі выдумка часам расцэньвалася як нешта састарэлае, што адмаўлялася ў імя аднаўлення рэальнага, дакументальна пацверджанага факта, даказвае, што «літаратура нашага стагоддзя – як і раней – шырока абапіраецца і на выдумку, і на нявыдуманыя падзеі і асобы. Пры гэтым адмова ад выдумкі ў імя следавання праўдзе факта, у шэрагу выпадкаў апраўданая і плённая, наўрад ці можа стаць магістраллю мастацкай творчасці: без апоры на выдуманыя вобразы мастацтва і, у прыватнасці літаратуру, нельга ўявіць. <...> Пасродкам выдумкі аўтар абагульняе факты рэальнасці, увасабляе свой погляд на свет, дэманструе сваю творчую энергію» [1, с. 93–94].

Яшчэ адна рыса новага журналізму – тактыка заглыблення ў матэрыял. Часта таленавітыя журналісты са звычайнай нататкі стваралі паўнавартасны мастацкі твор, выкарыстоўваючы розныя літаратурныя прыёмы. На думку Тома Вулфа, заснавальніка новага журналізму і аўтара «Анталогіі новай журналістыкі», якая ўключае 28 твораў 23 пісьменнікаў, для новага накірунку істотна агучванне ўласнага меркавання, што да пэўнага моманту ў журналістыцы не віталася [2]. Адступленне ад класічных вытокаў, спалучэнне жанраў, цяга да змены форм, шырокае выкарыстанне дакумента выявілася ў творчасці амерыканскіх аўтараў Трумэна Капотэ, Хантэра Томпсана, Нормана Мэйлера, аднак было арганічным і для прадстаўнікоў іншых літаратур (творы А. Баравіка, Э. Лімонава), у тым ліку і беларускай літаратуры, творы не толькі ўжо згаданай С. Алексіевіч, але і Я. Брыля, А. Федарэнкі, А. Наварыча. Безумоўна, традыцыі новага журналізму нельга механічна пераносіць з літаратуры амерыканскай на літаратуры іншых народаў свету, у кожнай з іх свой непаўторны шлях, свае традыцыі і адметныя прыёмы ўзнаўлення рэчаіснасці. Так, калі гаварыць пра Беларусь, то тут тэндэнцыі дакументальнай літаратуры, спосабы і формы выкарыстання дакумента, заглыбленне ў рэальнасць маюць трывалыя гістарычныя вытокі і традыцыі. Не заглыбляючыся ў далёкую гісторыю, можна прыгадаць «міжвольны і трагічны» (па вызначэнні А. Адамовіча) дакументалізм М. Гарэцкага, магнітафонную прозу самога А. Адамовіча, У. Калесніка, Я. Брыля, гістарычныя творы А. Наварыча, А. Федарэнкі, Г. Далідовіча і інш.

Блізкім да новага журналізму выступае накірунак так званай гонза-журналістыкі, стваральнікам якога выступае згаданы вышэй Хан-

тэр Стоктан Томпсан. У адрозненне ад новага журналізму, які больш блізкі да мастацкай літаратуры, гонза-журналістыка арыентуецца на журналісцкія жанры. Сляды «гонза» заўважаюцца ў лепшых праявах музычнай і спартыўнай журналістыкі, а таксама ў інтэрнэт-блогах, дзённікавых запісах.

Лічыцца, што для гонза найбольш прыдатнымі з'яўляюцца журналісцкія жанры: рэпартаж, падарожны нарыс, артыкул, эсэ, рэцэнзія, інтэрв'ю. Але ў большасці выпадкаў выкарыстоўваюцца сінтэтычныя формы. У сеціве, напрыклад, інфармацыйнай адзінкай для матэрыялу з'яўляецца «пост». Калі гаварыць пра змест гонза-матэрыялаў, то тут у процівагу аб'ектыўнаму погляду на падзею, характэрнаму для традыцыйнай журналістыкі, бярэцца суб'ектыўны падыход, і галоўную ролю адыгрываюць эмоцыі і перажыванні самога аўтара. Такім чынам, сама падзея, пра якую ідзе гаворка ў матэрыяле, адыходзіць на другі план, а апісваецца тое, што адбываецца вакол рэпарцёра: абстаноўка, людзі і іх паводзіны. Стыль гонза не мае рэгламентаваных норм, манера выказвання залежыць ад характару аўтара, пазіцыя якога выяўляецца ў тэксце на ўзроўні лексікі і граматыкі. У асноўным гонза-матэрыялы з'яўляюцца ў блогасферы і іншых сацыяльных сервісах, паколькі інтэрнэт-рэсурсы менш за ўсё падлягаюць цэнзуры, што спрыяе суб'ектыўнасці і разняволенасці выказвання.

Прастата падачы інфармацыі ў гонза і яе экспрэсіўнасць дазваляюць глыбей адчуць і ўспрыняць падзею, а яшчэ гонза прадастаўляе аўдыторыі свабодны і незалежны, хоць і суб'ектыўны, погляд на тую ці іншую сітуацыю. Тэндэнцыі гонза-журналістыкі ўсё часцей праяўляюцца ў сучасных недзяржаўных сродках масавай інфармацыі. Сёння публіцыстыка ўсё больш выразна персаніфікуецца. Аўтар перастае быць проста рэтранслятарам перадаванай інфармацыі – ён усё часцей становіцца яе інтэрпрэтатарам. Пункт гледжання канкрэтнай асобы цікавы сам па сабе. Інтэрв'ю, гутаркі, калонкі, каментары, лісты ў рэдакцыю сведчаць аб актыўнай ролі суб'екта выказвання ў сучаснай медыяпрасторы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Хализев В. Е.* Теория литературы. М. : Высшая школа, 1999. 240 с.
2. *Вулф Т.* Новая журналистика и Антология новой журналистики. М. : Амфора, 2011. 574 с.